*УДК 82.09–1+82.0*

*Я. А. ГАРАДНІЦКІ*

# СТЫЛЬ У СУАДНОСІНАХ З ІНШЫМІ КАТЭГОРЫЯМІ ПАЭТЫКІ ЛІТАРАТУРЫ

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 24.06.2013)*

Катэгорыя стылю з’яўляецца адным з важнейшых аспектаў літаратурнай творчасці, пакольні стыль сумяшчае ў сабе ў сінтэзаваным адзінстве праявы змястоўнага і фармальнага, індывідуальна-аўтарскага і традыцыйна-канвенцыйнага, замацаванага ў адносна ўстойлівых жанравых утварэннях.

З-за падобнай шырыні ахопу розных бакоў слоўнага мастацтва, скіраванасці на актыўнае ўзаемадзеянне процілеглых, антанімічных складнікаў творчага працэсу тэрміналагічна адназначнае вызначэнне стылю ў літаратуры выклікае пэўныя складанасці. Яно, па сутнасці, практычна немагчымае. Таму існуюць шматлікія азначэнні дадзенага паняцця ў самым шырокім дыяпазоне: ад тлумачэння стылю як выяўлення выключна фармальных, у першую чаргу моўных, уласцівасцей твора да яго разумення як мастацкага выяўлення асобаснасці аўтара.

В. Вінаградаў, які вельмі шмат увагі ў сваіх працах надаваў распрацоўцы праблем мовы мастацкай літаратуры, вылучаў тры «падыходы» ў даследаванні стылю, называючы, апрача лінгвістычнага, яшчэ літаратуразнаўчы і мастацтвазнаўчы. На яго думку, «літаратуразнаўчае разуменне стылю пакуль яшчэ не засноўваецца на глыбокай, самастойнай і агульнапрызнанай аснове: яно часцей за ўсё вагаецца паміж мастацтвазнаўчым і лінгвістычным» [1, с. 23].

Трэба заўважыць, што літаратуразнаўчае даследаванне, якое мае свае, адрозныя ад лінгвістычнага, спецыфічныя мэты, уключае ў сябе таксама і моўны стылістычны аналіз, г. зн. разгляд моўных сродкаў мастацкай выразнасці. Іншая справа, што часта ў літаратуразнаўчым даследаванні гэтым «сродкам» адводзіцца надзвычай сціплае месца. Яны ў большасці выпадкаў асацыіруюцца з фармальнымі прыкметамі літаратурнага твора. Само ж разуменне стылю менавіта ў літаратуразнаўчым сэнсе, як выяўленне спалучальнай сувязі паміж фармальнымі і змястоўнымі кампанентамі і ўзроўнямі структуры літаратурнага твора, скіроўвае аналіз у іншым кірунку, узбагачае яго ўніверсальнымі магчымасцямі сінтэзу.

Такое шматбаковае, аналітычна-сінтэзаванае пранікненне ў змястоўна-фармальныя глыбіні твора прыводзіць да разгляду яго як пэўнай ідэйна-мастацкай цэласнасці. У сучасным літаратуразнаўстве выразна абазначылася тэндэнцыя да паглыбленага вывучэння праблемы цэласнага аналізу літаратурнага твора. Гэта сапраўды перспектыўны напрамак даследаванняў, які адкрывае шырокія магчымасці ўзаемадзеяння змястоўных і фармальных складнікаў творчага працэсу.

Толькі пры разглядзе мастацкага свету таго або іншага аўтара як змястоўна-фармальнага адзінства існуе магчымасць успрымання катэгорыі стылю ва ўсёй паўнаце яе значэнняў. Менавіта ў мастацкім свеце, створаным пісьменнікам, стыль прадстае той субстанцыяй, у якой выяўляюцца ў непарыўнай сувязі як вонкавыя, прадметна-вобразныя ўвасабленні з’яў і аб’ектаў уяўляемай рэчаіснасці, так і ўнутраныя пабуджальныя матывы аўтара, рысы яго асобаснага аблічча і характару.

З разуменнем стылю ў яго шматстайных значэннях звязваецца перш за ўсё ўяўленне пра індывідуальную своеасаблівасць, адметнасць пэўных мастацкіх з’яў. Стыль, з аднаго боку – гэта заўсёды выяўленне прыкмет адрознення, унікальнасці, непадобнасці на ўжо існуючыя ўзоры.

Аднак, з другога боку, для стылю характэрна таксама і пэўная ступень тыпізацыі, тэндэнцыя да выяўлення ўстойлівых фармальна-змястоўных прыкмет.

Індывідуальны стыль пісьменніка ў пэўным сэнсе можа быць суаднесены і супрацьпастаўлены стылявым разнавіднасцям больш устойлівага характару, стылявым сістэмам, якія вызначаюцца большай маштабнасцю ўздзеяння на літаратурны працэс. Маюцца на ўвазе перш за ўсё такія стылявыя сістэмы, якія суадносяцца з пэўнымі літаратурна-мастацкімі напрамкамі і культурна-гістарычнымі эпохамі. Па сутнасці, паняцце стылю ў яго шырокім, «абагульняючым» значэнні вельмі блізкае да паняцця літаратурна-мастацкі напрамак.

У плане развіцця анталагічна-гістарычнай дыхатаміі назіраецца несумненная цесная сувязь стылю з жанрам. Жанр, таксама як і стыль, прадстаўляе сукупнасць пэўных характаралагічных рыс і адметнасцей літаратурнага твора ў іх тыпалагічнай выяўленасці і гістарычным развіцці. Стыль і жанр часта актыўна ўзаемадзейнічаюць між сабой, утвараючы гістарычна абумоўленыя, цэласныя мастацкія ўтварэнні, у якіх выразна праяўляюцца як жанравыя, так і стылявыя прыкметы.

Менавіта жанр, пачынаючы ад эпохі Антычнасці і да канца Сярэдневякоўя, становіцца галоўным аб’ектам увагі пры даследаванні тэарэтычных аспектаў літаратурнай творчасці. Гэта працяглая ў гістарычным плане эпоха, для якой было характэрна *жанравае мысленне*. На аснове аналізу заканамернасцей жанравага развіцця выпрацоўваліся агульныя ўяўленні пра магчымасці той або іншай жанравай разнавіднасці і формы. Суб’ект творчасці наогул выключаўся з разгляду, па сутнасці, ігнараваўся.

На аснове вывучэння змястоўных, фармальных і функцыянальных асаблівасцей літаратурных твораў распрацоўвалася жанравая класіфікацыя, якая выконвала нарматыўную ролю. Пачынаючы ад Арыстоцелевай, усе *паэтыкі* прадугледжвалі менавіта такі нарматыўны характар у адносінах да жанру як пэўнай канстанты. Кожны асобны літаратурны твор быў трывала ўпісаны ў адпаведную яму жанравую сістэму і ўяўляў сабой не што іншае як канкрэтна-адзінкае ўвасабленне агульнай жанравай мадэлі.

Канец XVIII – пачатак XIX стагоддзя быў часам карэннага змянення мастацкай парадыгмы. На змену жанраваму мысленню прыходзіла ўспрыманне суб’ектыўнасці як асноўнага стылеўтваральнага фактару літаратурнай творчасці. Роля і месца жанру ў агульнай мастацкай сістэме былі карэнным чынам пераасэнсаваны. Як заўважае М. Гіршман, «калі ў сістэме жанравага мыслення літаратурны твор успрымаўся як варыяцыя жанру, то ў сучаснай свядомасці, наадварот, жанр выступае як адзін з бакоў твора – самастойнага мастацкага цэлага» [2, с. 4].

Жанр, такім чынам, па-ранейшаму з’яўляецца ў многім вызначальнай для літаратурнага твора катэгорыяй, аднак з «узору», «мадэлі» ён ператвараецца ў адзін з фактараў, які садзейнічае набыццю творам пэўнай структурнай аформленасці і канкрэтна-гістарычнай мастацкай характэрнасці. У сучаснай літаратуры назіраецца тэндэнцыя да большай жанравай свабоды, утварэння шматлікіх новых жанравых мадыфікацый, у якіх асобныя жанравыя прыкметы спалучаюцца ў своеасаблівым, індывідуалізаваным выглядзе.

У беларускай літаратуры значнае пашырэнне атрымалі так званыя *аўтарскія жанры*. У прозе гэта перш за ўсё аўтарскія мадыфікацыі традыцыйнага для нацыянальнай літаратуры жанру *абразка*. Ужо на пачатку станаўлення гэтай жанравай разнавіднасці творы беларускіх аўтараў вызначаліся індывідуальным характарам, мастацка-стылявой своеасаблівасцю. У гэтым плане плённым уяўляецца параўнанне жанрава-стылявой адметнасці малафарматных празаічных твораў Ядвігіна Ш., К. Каганца, Я. Коласа, З. Бядулі, М. Гарэцкага.

Унікальнай жанравай з’явай у гісторыі беларускай прозы XX ст. з’яўляюцца «Казкі жыцця» Я. Коласа, прытчавасць і алегарызм якіх паяднаны з выразна выяўленай аўтарскай пазіцыяй.

У другой палове XX ст. яшчэ больш узрасла папулярнасць жанру празаічнай мініяцюры, чаму ў значнай ступені садзейнічала актыўная і плённая праца ў гэтым кірунку Я. Брыля. Услед за прызнаным майстрам празаічнага слова да гэтай жанравай разнавіднасці звярнуліся і іншыя сучасныя пісьменнікі, у тым ліку такія паэты, як К. Камейша, Л. Галубовіч і інш.

Адметнасць і прыцягальнасць дадзенай адносна свабоднай, не рэгламентаванай строгімі жанравымі рамкамі формы празаічнага дыскурсу заключаюцца якраз у лірыка-эпічным узаемапранікненні, прыкметнай лірызацыі празаічнага тэксту праз суб’ектывізацыю аўтарскага выяўлення.

Блізкай па сваіх жанрава-стылявых характарыстыках да гэтай, традыцыйнай для беларускай літаратуры, «дзённікавай» формы дыскурсу з'яўляецца эсэістыка. Гэта, сапраўды, адзін з самых суб'ектывізаваных і аўтарскіх жанраў, хоць яго асаблівасць заключаецца ў тым, што якраз жанравыя прыкметы праяўляюцца тут у аслабленым выглядзе. У беларускай прозе ўжо склалася класіка эсэістыкі, прадстаўленая творамі У. Караткевіча, М. Стральцова, В. Карамазава і інш.

У паэзіі тэндэнцыя да стварэння аўтарскіх жанравых мадыфікацый найбольш выразна выявілася ў творчасці А. Разанава, аўтара, схільнага да мастацкіх пошукаў і эксперыментатарства. Аўтарскія жанравыя формы А. Разанава вызначаюцца сваёй шматстайнасцю, рознай ступенню суаднесенасці ў іх адзнак верша і прозы, медытацыі і наратыву, унутранай формы і падтэксту. Гэта формы, якія па сваёй стылявой характэрнасці, выяўленаму ў іх светаадчуванню менавіта індывідуальныя, непаўторныя, напоўненыя асабовым зместам. Разам з тым варта адзначыць і тое, што А. Разанаў, свараючы ўласныя жанравыя мадыфікацыі, засноўваецца таксама і на жанравай традыцыі. Так, напрыклад, яго *версэты* маюць адчувальную сувязь з рытміка-інтанацыйнай структурай біблейскага тэксту.

Жанр *структураваны*, але ён таксама цесна і непарыўна звязаны з канкрэтна-індывідуальным, вобразна-непаўторным, паколькі заўсёды прадстаўлены пэўнымі адзінкавымі творамі. Сам па сабе жанр як пэўная мадэль твора, як і любое іншае паняцце, існуе толькі ва ўяўленні. У тэкставым увасабленні існуюць толькі асобныя творы. Здольнасць рэпрэзентаваць адзінкавае, канкрэтнае ў абагульнена-адцягненым паняцці якраз і з'яўляецца адной з асноўных функцый жанру.

Стылю таксама ўласціва падобная функцыянальнасць, аднак у меншай ступені. Стыль, таксама, як і жанр, прадстаўляе ўяўленні пра агульнае, тыпалагічнае, хоць асноўная яго задача – быць рэпрэзентантам своеасаблівага, адметнага, індывідуальна-характэрнага.

Жанр і стыль выступаюць як узаемадапаўняльныя сферы выяўлення змястоўна-фармальнага, мастацкага адзінства літаратурнай творчасці. Яны зближаюцца якраз дзякуючы сваёй антанімічнасці, палярнай вектарнай скіраванасці ў адносінах да *агульнага/асаблівага*. Характэрнай адзнакай, якая сведчыць аб такім дыялектычным адзінстве, з'яўляецца распаўсюджанасць сінтэтычных спалучэнняў жанравых і стылявых прыкмет, якія абазначаюцца тэрміналагічна як *жанрава-стылявыя плыні*.

У дадзеным выпадку акцэнтуецца сувязь жанру і стылю з гістарычным кантэкстам, гэтыя катэгорыі разглядаюцца ў іх гістарычнай зменлівасці, развіцці ў часе. Аналізуючы жанрава-стылявыя плыні, якія склаліся ў нацыянальнай літаратуры на працягу значнага перыяду, мы тым самым маем магчымасць назіраць за тым, якім чынам адбывалася ўзаемадзеянне жанравых і стылявых уласцівасцей літаратуры, як суадносіліся між сабой агульнатыпалагічныя і канкрэтна-характаралагічныя прыкметы.

Стыль і жанр, як было ўжо адзначана, цесна звязаны з рухам мастацкіх форм у часе, з гістарычным развіццём літаратуры. У гэтым сэнсе яны становяцца ключавымі аб'ектамі даследавання *гістарычнай паэтыкі* як раздзела літаратуразнаўства, у якім вывучаюцца асаблівасці гістарычнага развіцця мастацкіх форм у іх цеснай спалучанасці з ідэйна-эстэтычнымі і мастацкімі ўяўленнямі і поглядамі, характэрнымі для асобнага напрамку або перыяду.

Паэтыка і стыль – паняцці, безумоўна, блізкароднасныя, паколькі апелююць да мастацкай формы ў яе змястоўнай увасобленасці. Аднак, несумненна, што між імі існуе істотная розніца. Перш за ўсё яны адносяцца да рознаўзроўневых паняццевых радоў. Паэтыка значна шырэй па сваймў аб'ёму і ахопу бакоў і аспектаў літаратурнай творчасці.

Уласна кажучы, дадзены тэрмін выкарыстоўваецца ў двух асноўных значэннях. У першым з іх паэтыка разглядаецца як навуковая дысцыпліна, адзін з асноўных раздзелаў літаратуразнаўства, задачай якога з'яўляецца вывучэнне «складу, пабудовы і функцый твораў, а таксама родаў і жанраў літаратуры» [4, с. 143]. Даючы такое азначэнне, В. Халізеў заўважае, што «ў далёкія ад нас стагоддзі (ад Арыстоцеля і Гарацыя і да тэарэтыка класіцызму Буало) тэрмінам "паэтыка" абазначаліся вучэнні аб слоўным мастацтве ў цэлым» [4, с. 143], г. зн. што, па сутнасці, пад паэтыкай у антычныя часы і ў сярэднявеччы разумеліся тэарэтыка-абагульняючыя аспекты слоўнага мастацтва, тое, чым сёння займаецца тэорыя літаратуры.

У другім жа асноўным сваім значэнні тэрмін паэтыка адносіцца да самога *прадмета* вывучэння, г. зн. да ўсёй сукупнасці з'яў, разглядаемых у гэтым раздзеле літаратуразнаўства. У гэтым сэнсе паняцце паэтыка дастасоўваецца да пэўных аб'ектаў філалагічнага даследавання – мастацкіх напрамкаў і плыней, творчасці асобных аўтараў (*паэтыка рамантызму, паэтыка Багдановіча* і г. д.).

Сапраўды, арэол ужывання дадзенага слова ў апошні час надзвычай пашырыўся, што прыводзіць да яго пэўнай метафарызацыі, размывання выразных тэрміналагічных граніц. Выклікана гэта з'ява, на нашу думку, як пошукам адэкватных сродкаў тэрміналагічнага абазначэння новых у метадалагічных адносінах сфер даследавання, так і некаторай інерцыяй моды, якая, на жаль, пранікае і ў літаратуразнаўчы дыскурс, аказваючы на яго ў пэўным сэнсе негатыўнае ўздзеянне.

Нягледзячы на такую ўскладненую разнастайнасць дыяпазону значэнняў тэрміна паэтыка, абумоўленую ў многім паглыбленай цікавасцю да пытанняў, звязаных са структурнай арганізацыяй аб'ектаў даследавання, застаецца актуальным вылучэнне ў літаратуразнаўчым дыскурсе двух асноўных значэнняў: 1) паэтыка як навуковая дысцыпліна і 2) паэтыка як прадмет даследавання.

Неабходна адзначыць, што пытанні тэрміналагічнай атрыбуцыі адносна важнейшых катэгорый літаратуразнаўчай навукі і сумежных з ёю дысцыплін застаюцца і па сённяшні дзень у значнай ступені дыскусійнымі. Адным з такіх даволі спрэчных пытанняў з'яўляецца пытанне аб меры выяўлення ў паэтыцы і стылі індывідуальна-аўтарскага і агульналітаратурнага і аб суаднесенасці між сабой паняццяў паэтыкі і стылю.

Так, напрыклад, Ю. Мінералаў, аўтар кнігі «Теория художественной словесности (поэтика и индивидуальность)» (1999) выказваецца аб неправамернасці выкарыстання паняцця *паэтыка* ў дачыненні да творчасці асобнага аўтара. Заўважыўшы, што ў апошні час «паявілася вялікая колькасць публікацый пра "паэтыку" канкрэтных мастакоў», ён сцвярджае: «такая "інавацыя" ў выкарыстанні тэрміна не ўяўляецца нам карэктнай і плённай» [3, с. 9].

Даследчык задаецца пытаннем: ці мэтазгодна наогул існаванне паняцця *індывідуальная паэтыка*? Заўважым пры гэтым, што дадзенае словазлучэнне Ю. Мінералаў бярэ ў двукоссе, што адразу паказвае на яго адносіны да гэтай з'явы. Адказ, як і меркавалася, атрымоўваецца адназначна адмоўным. «Ніякай "індывідуальнай паэтыкі" пісьменнік, строга кажучы, не стварае» [3, с. 9].

Называючы індывідуальную паэтыку «фікцыяй», Ю. Мінералаў сцвярджае, што ва ўсіх выпадках, калі выкарыстоўваецца дадзенае азначэнне, яно можа быць заменена іншым, а менавіта азначэннем *індывідуальны стыль пісьменніка*. Розніца паміж паэтыкай і стылістыкай, па сутнасці, зводзіцца Ю. Мінералавым да таго, што першая вывучае аб'ект (сродкі, мастацкую матэрыю) як фармалізаваную рэч, як структуру, а другая гэты ж аб'ект разглядае з боку яго ***ўжывання*** ў мастацкай практыцы. Гэта значыць, у дзвюх асобных навуковых дысцыплін аказваецца **адзін і той жа прадмет даследавання**, а ўсё адрозненне зводзіцца да размежавання функцый.

Ю. Мінералаў вызначае паэтыку як дысцыпліну адцягнена-разумовага характару, якая мае справу выключна з абстрагаванымі паняццямі і катэгорыямі, а стылістыку – як дысцыпліну чыста практычную, скіраваную на выяўленне таго, як гэтыя паняцці і катэгорыі суадносяцца з рэальным мастацкім працэсам. Паэтыка, на яго думку, вывучае тропы, сюжэтыку, кампазіцыю і г. д. «з "адцягненнага" пункту гледжання – безадносна да іх мадыфікацый у стылі канкрэтных мастакоў, у канкрэтных творах, у канкрэтных кантэкстах» [3, с. 10]. Наогул цяжка сабе ўявіць, якім чынам можна «вывучаць» пэўныя аспекты паэтыкі, элімінуючы іх цалкам ад канкрэтыкі творчасці асобных аўтараў, ад гістарычнага развіцця літаратуры.

Галоўная асаблівасць і прызначэнне стылю, як нам уяўляецца, заключаецца ў тым, што ён служыць пасрэднікам не толькі паміж формай і зместам, але таксама і паміж аўтарам і творам. Для большасці даследчыкаў, апрача тых, хто прытрымліваецца жорсткай пазіцыі фармалістычнай школы аб адасобленасці аўтара ад прадукту яго дзейнасці, несумненнымі з'яўляюцца сувязь аўтара са сваім творам, тое ўздзеянне, якое аказваюць на твор аўтарскі светапогляд, кругагляд, жыццёвы вопыт, біяграфічныя абставіны і г. д. Аднак верыфікацыя гэтых сувязей і ўплываў з'яўляецца надзвычай складанай задачай, паколькі справа датычыцца вельмі тонкай матэрыі.

Тут мы маем справу з праявамі псіхалагічнага характару, якія ўступаюць ва ўзаемадзеянне з матэрыяй, тэкставай прасторай літаратурнага твора. Наконт механізмаў і спосабаў такога ўзаемадзеяння меркаванні могуць быць самыя розныя, але ўсе яны знаходзяцца, па сутнасці, у сферы дапушчэння і не могуць мець адназначнага пацвярджэння аналітычным шляхам. Складанасць вызначэння самога паняцця «стыль» абумоўлена перш за ўсё менавіта гэтымі акалічнасцямі. Стыль – гэта не толькі індывідуальнае і асаблівае. Таму дадзеную катэгорыю суадносяць не толькі з творчасцю аднаго пісьменніка, але і з пэўным мастацкім напрамкам, плынню і нават з культурна-гістарычнай эпохай.

## Літаратура


1. *Виноградов, В. В.* Проблема авторства и теория стилей / В. В. Виноградов. – М.: Гос. изд-во худож. лит., 1961. – 614 с.

2. *Гиршман, М. М.* Литературное произведение. Теория и практика анализа / М. М. Гиршман. – М.: Высш. школа, 1991. – 160 с.

3. *Минералов, Ю. И.* Теория художественной словесности (поэтика и индивидуальность) / Ю. И. Минералов. – М.: ВЛАДОС, 1999. – 360 с.

4. *Хализев, В. Е.* Теория литературы / В. Е. Хализев. – М.: Высш. школа, 2000. – 398 с.



*Ya. A. HARADNITSKI*


**STYLE IN CORRELATIONS WITH OTHER CATEGORIES OF THE LITERARY POETICS**

## Summary


In this article the problem of the artistic style has been investigated in wide context of its interaction with other categories of poetics of the literature such as genre and artistic literature works. System of attitudes of these categories has been regarded in view of integrated analysis of the literary work which take into consideration dialectic form and matter unity.

Style is determined as organic combination in artistic world of the literary work such individual traits and formal-profound signs which are common for certain artistic systems.